Сядзі і глядзі

# Яны разгадвалі таямніцы Сусвету

**Сёння адзначаецца Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі. З гэтай нагоды ў тэлеэфіры з'явіліся тэматычныя выпускі любімых праграм, а таксама дакументальныя кінастужкі з фондаў Белтэлерадыёкампаніі.**

Сёлета ўвага беларусаў да тэмы вывучэння космасу асабліва вялікая. Зусім нядаўна ў складзе экіпажа карабля «Саюз МС-24» з Міжнароднай касмічнай станцыі вярнулася першая жанчына-касманаўт суверэннай Беларусі Марына Васілеўская. Гэтай гістарычнай падзеі і ў святочны дзень аддавалі максімум увагі. Таксама сёння ўвечары сацыякультурны тэлеканал звернецца да фондаў Белтэлерадыёкампаніі і прадэманструе тэматычныя дакументальныя фільмы. Так, у 22.55 пакажуць кінастужку «Адной зоркі я паўтараю імя...» рэжысёра Уладзіміра Бокуна, якая была знята ў 1981 годзе. Кінапраца распавядае пра ўраджэнца Брэсцкай вобласці, двойчы Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта СССР Пятра Клімука.



А працягне тэматычны кінапаказ дакументальны фільм «Зямное прыцягненне Івана Міско» (рэжысёр Сяргей Кацьер, 2023 год). У ім гледачы сустрэнуцца з лаўрэатам прэміі Саюзнай дзяржавы, народным мастаком Беларусі Іванам Міско, які стварыў цэлую галерэю скульптурных партрэтаў ледзь не ўсіх касманаўтаў былога СССР. Сярод яго герояў і ўраджэнцы нашай краіны Уладзімір Кавалёнак, Пётр Клімук і Алег Навіцкі. У фільме скульптар расказа пра свой шлях у творчасці, пакажа сваю майстэрню, а таксама са здымачнай групай пабывае на малой Радзіме і там падзеліцца запаветнымі ўспамінамі. А самых юных тэлегледачоў у праграме «Калыханка» чакае паказ мультфільма на касмічную тэму.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 215

**№ 56**



№ 56 Я. Кандрачэнка (Гомель)

**Белыя простыя:** d2, f2, e3, f4, d6 (5)

**Чорныя простыя:** b4, h4, c5, f6, h6, g7 (6)

Наступныя дзве пазіцыі-»двайняты» прапануе Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў).

**№ 57**

**Белыя простыя:** e1, d4, f4, e5, e7 (5)

**Чорныя простыя:** b2, f2, h2, c3, g3, b4, a7 (7)

**№ 58**

**Белыя простыя:** e1, d4, f4, e5, e7 (5)

**Чорныя простыя:** b2, f2, h2, c3, g3, b4, g7 (7)

№ 59 А. Баланюк (г. Цепладар Адэскай вобл.)

**Белыя простыя:** 48, 50, 42, 40, 31, 29, 25, 14 (8)

**Чорныя простыя:** 37, 39, 32, 26, 28, 17, 20, 7 (8)

**№ 60** Е. Зубаў (Масква)

**Белыя простыя:** 46, 48, 44, 37, 38, 32, 35, 26, 27, 28 (10)

**Чорныя простыя:** 41, 36, 40, 29, 16, 17, 18, 19, 20 (9)

Тры наступныя кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі па правілах бразільскіх шашак.

**№ 61**

**Белыя простыя:** c1, b2, g5, c7(4)

**Чорныя простыя:** a3, b4, d4, g7 (4)

**№ 62**

**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, e3, g5 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, e5, c7, g7 (4)

**№ 63**

**Белыя простыя шашкі:** g3, f4, h4, g5, b6, d6, a7, c7 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, h2, b4, a5, e5, h6, b8, d8 (9)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Шашачныя юбілеі. У канцы сакавіка 75-гадовы юбілей сустрэў Уладзімір Васільевіч Бяляеўскі — 3-разовы чэмпіён Беларусі па рускіх шашках, майстр спорту, удзельнік фіналаў чэмпіянату СССР.

50 гадоў споўнілася міжнароднаму гросмайстру Андрэю Валюку — шматразоваму пераможцу і прызёру чэмпіянатаў свету, Еўропы і Беларусі, вядомаму трэнеру.

З 22 па 28 сакавіка ў гасцінічным комплексе «Турыст» г. Гомеля праходзіла першынство Беларусі па шашках-100 (моладзь 1998—2004 гг. н., юніёры, юніёркі 2005—2007 гг. н., юнакі і дзяўчаты 2008—2010 гг. н., 2011—2013 гг.н., 2014 г. н. і маладзейшыя). Пераможцамі ў сваёй катэгорыі ўзросту сталі: Кахно Эя, Дубініна Вера, Швед Яўгенія, Нікалаева Вікторыя, Петрусёва Паліна, Барадзіч Анатоль, Лагуткоў Мікіта, Акуловіч Марк, Жукоўскі Яўген, Дарашэнка Сцяпан.

30 сакавіка ў Брэсце адбыўся адкрыты абласны турнір па шашках-64 памяці Г. С. Лабекінай. Перамог Віктар Бялецкі (Бяроза).

**Праверце свае рашэнні.** Выпуск № 214 ад 29.03.2024.

№ 49 1. e3-d4 d6:b8 2. d4:b2 a3:c1 3. g3-f4 e5:e1 4. g1-f2 e1:g3 5. h2:f4 c1:g5 6. h4:d8+

№ 50 1. f2-e3 f4:d2 2. g1-f2 c5:g1 3. e7-f8 a3:e7 4. f8:a7+

№ 51 1. e3-d4 a3:g5 2. d4:d8 d6:f4 3. d8:h4 f4-e3 4. h4-f6 h2:f4 5. h6-g7 e3-f2 6. f6-d8 h8:f6 7. d8:g1+

№ 52 1. e1-f2 d6:b4 2. f2-g3 a3:c1 3. d4-e5 f6:f2 4. h4:d8 c1:g5 5. d8:e1 f2:h4 6. h2-g3 h4:f2 7. e1:d8+

№ 53 1. f4-e5 c3:g3 2. e5-d6 c5:e7 3. f6:d8 h8:f6 4. d8:h8 h4:f6 5. h8:h2 +

№ 54 1. 44-40 14:32 2. 25:05 34:45 3. 48-43 37:39 4. 05:46 26:37 5. 46:50 +

№ 55 1. 19-14 28:46 2. 14:05 46:34 3. 05-37 31:42 4. 47:49+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавічскі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Наша кіно

# КАЛІ ДАБРО І ПРАЎДА ПЕРАМАГАЮЦЬ

**На выхадных і на наступным тыдні для прагляду на сацыякультурным тэлеканале прапануюць шэраг кінастужак, якія даўно ўжо сталі класікай. Сакрэт іх поспеху абумоўлены як талентам стваральнікаў, так і матэрыялам, які лёг у аснову кінааповедаў. І разам з тым яны і сёння нагадваюць усім незалежна ад узросту пра вечныя каштоўнасці, паказваюць герояў, якім суперажываеш і ў якіх вучышся мудрасці. А галоўнае, праз нейкі час ізноў шукаеш сустрэчы з імі.**

Напрыклад, у суботу, 13 красавіка, раім паглядзець кінааповесць «Праз могілкі», знятую на «Беларусьфільме» Віктарам Туравым у 1964 годзе. Кінастужка, створаная па аднайменнай аповесці Паўла Ніліна, была рэжысёрскім дэбютам, аднак заваявала ўвагу шматлікіх гледачоў. Варта адзначыць, што дыпломамі і ўзнагародамі адзначылі на V кінафестывалі Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі ў 1965 годзе таксама акцёра Уладзіміра Мартынава і аператара Мікалая Забалоцкага за выяўленчае рашэнне фільма. А ў 1994 годзе рашэннем ЮНЕСКА кінастужка ўвайшла ў спіс ста найлепшых фільмаў пра вайну. Сюжэт, мяркую, многім кінааматарам вядомы, таму проста знайдзіце час, каб яшчэ раз згадаць гісторыю партызана Міхася Пашкевіча і ўсіх, з кім звяло яго жыццё восенню 1942 года... Дарэчы, пасля прагляду кінастужкі «Праз могілкі» прыемным падарункам для прыхільнікаў кінамастацтва стане таксама паказ дакументальнага фільма «У кадры і за кадрам. Кінааператар Анатоль Забалоцкі» (Белтэлерадыёкампанія, 2022 г.).

А вось 14 красавіка раніцай самым маленькім гледачам (але можа і ўсёй сям'ёй паглядзець) пакажуць казку «Рыжы, сумленны, закаханы», знятую рэжысёрам Леанідам Нячаевым сорак гадоў таму на «Беларусьфільме». Цікава паназіраць за тым, як маленькім лісянятам выкладаюць у школе «Хітралогію», бо і жыць ім патрэбна будзе падманам. Аднак лісяня Людвіг, унук настаўніка, адказваецца спасцігаць навуку махлярства і афер... Гэтая казка і малым, і дарослым падорыць шмат павучальнага і, можа, усе мы зноў згадаем, як важна ў жыцці заставацца сабой і рабіць уласны выбар.



У сераду, 17 красавіка, споўніцца 125 гадоў з дня нараджэння актрысы тэатра і кіно, народнай артысткі Расіі Вольгі Жызневай. У гэты дзень на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць мастацкі фільм «Розныя лёсы» (1956 г.), у якім актрыса стала выканаўцай ролі маці-гераіні. Кінапраца рэжысёра Леаніда Лукава знаёміць гледачоў з гісторыяй маладых ленінградцаў, якія толькі робяць свае першыя крокі ў дарослае жыццё. Але ніхто з іх не ведае, што чакае наперадзе і хто будзе побач на гэтым шляху.

У гэты ж дзень 125 гадоў таму з'явілася на свет беларуская актрыса, народная артыстка БССР Лідзія Ржэцкая (1899—1977). Прыхільнікаў артысткі парадуюць у дзённым эфіры на «Беларусь 3» паказам мастацкага фільма «Хто смяецца апошнім», знятым на «Беларусьфільме» ў 1954 годзе. У акцёрскім складзе задзейнічаны таксама Леанід Рахленка, Глеб Глебаў, Уладзімір Уладзімірскі, Зінаіда Баварская і іншыя. Сатырычная камедыя была знятая рэжысёрам Уладзімірам Корш-Сабліным па аднайменнай п'есе беларускага драматурга Кандрата Крапівы. І пасылы гэтай экранізацыі знакамітага твора заўседы будуць прыцягальнымі для гледачоў, таму што заўжды ва ўзаемаадносінах людзей ёсць месца выпадковасцям і героі патрэбны нашаму свету, каб дабро і праўда ў фінале ўсё ж такі перамагалі!

**Алена ДРАПКО.**


## «Звязда» — руплівым гаспадарам»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або на I паўгоддзе 2024 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце з 15 лютага да 19 красавіка 2024 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.



Сярод падпісчыкаў будуць разыграныя сем набораў садовых інструментаў Garvill JC-507 і суперпрыз — культыватар садовы Tomadica TOR-32TLR. Вынікі будуць апублікаваныя ў газеце да 4 мая 2024 года.



Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2024 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або на I паўгоддзе 2024 года. Пасля 30 чэрвеня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 28 ад 9 лютага 2024 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4399 ад 30.01.2024 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або I паўгоддзе 2024 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________ на II квартал або I паўгоддзе 2024 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [        ] (індэкс) ________

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!